**РАСПАРАДЖЭННЕ
ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**РАСПОРЯЖЕНИЕ
ПРЕМЬЕР-МИНИСТРА
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

24 студзеня 2017 г. № 27р

**г. Мінск** **г. Минск**

Аб стварэнні рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання

У мэтах арганізацыі шырокага святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання:

1. Стварыць рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання (далей – рэспубліканскі арганізацыйны камітэт) у складзе згодна з дадаткам.

2. Рэспубліканскаму арганізацыйнаму камітэту зацвердзіць план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і забяспечыць яго рэалізацыю.

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму аказваць садзейнічанне рэспубліканскаму арганізацыйнаму камітэту ў падрыхтоўцы і правядзенні названых мерапрыемстваў.

3. Фінансаванне арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, ажыццяўляць у межах сродкаў, прадугледжаных рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў, а таксама за кошт іншых крыніц.

Прэм'ер-міністр
Рэспублікі Беларусь А.Кабякоў

АПАРАТ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЛЯ ДАКУМЕНТАЎ
4

05

Дадатак
да распараджэння Прэм’ер-міністра
Рэспублікі Беларусь
24.01.2017 № 27р

Склад рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання

| | | |
|---|---|---|
| Ананіч Лілія Станіславаўна | – | Міністр інфармацыі (сустаршыня рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта) |
| Святлоў Барыс Уладзіміравіч | – | Міністр культуры (сустаршыня рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта) |
| Вялічка Алег Мікалаевіч | – | намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама |
| Кілін Сяргей Якаўлевіч | – | намеснік Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі |
| Кунцэвіч Андрэй Уладзіміравіч | – | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама |
| Лісковіч Віктар Андрэевіч | – | намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама |
| Прывалаў Уладзімір Аляксандравіч | – | намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама |
| Пенін Уладзімір Пятровіч | – | намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама |
| Рудзікава Віталіна Уладзіміраўна | – | першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама |
| Рыбакоў Валянцін Барысавіч | – | намеснік Міністра замежных спраў |
| Сірэнка Віктар Іванавіч | – | намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама |
| Якжык Віктар Віктаравіч | – | намеснік Міністра адукацыі |